# Сёння скончыла сваю работу 25-ая Юбілейная міжнародная выстава Bakutel 2019

Bakutel - не толькі самая маштабная IT-выстава ў Прыкаспійскім рэгіёне, але і унікальная бізнэс-пляцоўка для нетворкінга, дзе завязваюцца трывалыя кантакты і абмяркоўваюцца пытанні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

На працягу 25 гадоў выстава штогод збірае лідэраў тэлекамунікацыйнага рынку, з'яўляючыся паспяховай арэнай для дэманстрацыі IT-прадуктаў і паслуг.

Актыўны ўдзел у працы Bakutel-2019 прыняла дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале з Міністрам сувязі і інфарматызацыі Канстанцінам Шульганом.
Нацыянальны стэнд Беларусі наведалі Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Ільхам Аліеў і Першы Віцэ-прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Мехрыбан Аліева, Міністр транспарту, сувязі і высокіх тэхналогій Азербайджанскай Рэспублікі Рамін Гулузадэ, Генеральны сакратар Міжнароднага саюза электрасувязі Хоулінь Чжао і іншыя афіцыйныя асобы, якія прыбылі на выставу Bakutel 2019.

Беларусь неаднаразова прадстаўляла нацыянальную экспазіцыю на выставе Bakutel. У гэтым годзе прадстаўлены калектыўны стэнд арганізацый сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) Беларусі пад агульнай канцэпцыяй «Беларусь - краіна лічбавых магчымасцяў».

Гасцям і ўдзельнікам выставы прэзентаваны дасягненні Рэспублікі Беларусь у галіне сувязі і ІКТ. Bakutel таксама стала пляцоўкай для абмеркавання напрамкаў далейшага развіцця ўзаемавыгаднага беларуска-азербайджанскага супрацоўніцтва ў галіне сувязі і інфарматызацыі, у тым ліку, выкарыстоўваючы патэнцыял Міжнароднага Форуму ТІБО, які штогод праводзіцца ў Мінску і з'яўляецца найбуйнейшай у рэгіёне прафесійнай падзеяй у сферы ІКТ.

XXVII Міжнародны ІКТ Форум ТІБО адбудзецца ў Мінску з 18 па 22 мая 2020 года.

Паглядзець асноўныя вынікі ўдзелу https://www.youtube.com/watch?v=qWwnbzbZUBo

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/06-12-2019-5697*